Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пролетары ўсіх краін, злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 13 (395) Нядзеля, 30 студзеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 903 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвоная Зьмена, Менск, Комсам. 25.

Узмоцнім абараназдольнасьць!

На Маскоўскай партыйнай конфэрэнцыі тав. Варашылаў адзначыў, што вайна пагражае Эўропе, пагражае ўсяму сьвету.

Узбраеньне капіталістычных дзяржаў прымае вялікія разьмеры—Францыя, Англія, Італія, Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты перад імпэрыялістычнай вайной на ўзбраеньне трацілі 1 мільярд 930 мільёнаў руб., а цяпер у 1926 годзе 3 з паловай мільярды.

Разам з падрыхтоўкай да вайны паміж сабою капіталістычныя дзяржавы адносна рыхтуюць яе і супроць нас.

З німі мяжуюцца дробныя капіталістычныя дзяржавы: Польшча, Румынія, Эстонія, Латвія, Літва, гэтыя дзяржавы таксама, як і буйныя; рыхтуюцца да вайны, да вайны супроць нас, іх накіроўваюць на нас буйныя капіталістычныя дзяржавы, галоўным чынам,—Англія, якая арганізоўвае і натраўляе іх на нас. Узбраеньне гэтых дзяржаў таксама расьце, растуць і іх арміі.

Вось тыя небясьпекі, якія нам пагражаюць і навязваюць вайну. Калі гэта вайна будзе нам навязана—сказаць нельга, але да яе трэба быць гатовым заўсёды.

Абарона краіны, у выпадках нападаў на нас,—гэта не толькі справа Чырвонай арміі — гэта справа кожнай арганізацыі, установы, кожнага працаўніка. Армія гэта ўвесь узброены працоўны народ. Вось якую задачу павінен перад сабой паставіць кожны з нас, кожны з нас павінен быць гатовым стаць на абарону краіны, рыхтавацца к гэтаму супольна з кожнадзённай работай. Кожны павінен яшчэ больш працаваць над адбудаваньнем Савецкай краіны.

Ня гледзячы на тое, што Авіяхім ОСО зьяўляецца важнай арганізацыяй, маючай вялікае значэньне ў справе абароны краіны, мы гэтай організацыі звярочваем мала ўвагі, малы прымаем удзел і ў яе рабоце. Трэба павялічыць увагу, комсамольцам трэба прымаць актыўны ўдзел у рабоце ОСО Авіяхіму.

Калі мы будзем падрыхтаваны — мы заўсёды зможам даць адпор нападкам на нас.

Як працаваў Цэнтр. Комітэт УсеЛКСМ.

(Рэзолюцыя пленуму ЦК ЛКСМБ па дакладу тав. Косарава аб дзейнасьці ЦК УсеЛКСМ).

Заслухаўшы даклад тав. Косарава аб дзейнасьці Цэнтральнага Комітэту УсеЛКСМ, Пленум ЦК ЛКСМБ адзначае:



Тав. КОСАРАЎ.

1. Чоткі напрамак ЦК у пытаньнях унутрыпартыйных здарэньняў забясьпечыла правільны напрамак усяго комсамолу ў гэтых здарэньнях і гэта-ж паказвае на павялічэньне ідэйнага ўзроўню ўсяго комсамолу, узрастаньне здаровай палітычнай сьвядомасьці ў яго шэрагах.

2. Сучасная палоса разьвіцьця УсеЛКСМ характэрызуецца ростам здаровых культурна-экономічных запытаньняў у рабоча-сялянскай моладзі.

На грунце апошніх гаспадарчых дасягненьняў і правільнага напрамку ЦК ува ўсёй працы саюзу вытвараецца далейшае павялічэньне грамадзка-палітычнай актыўнасьці рабоча-сялянскай моладзі, што высоўвае задачу далейшага напрамку ў русло актыўнага ўдзелу моладзі ў розных галінах грамадзка-палітычнай працы правільнай ўвязкі ўсёй культурна-асьветнай працы з моцна правядзёнай палітычна-выхаваўчай працай саюзу. Побач з гэтымі сталымі зьявішчамі перажываемы саюзам момант характарызуецца ростам адмоўных зьявішч у часткі рабоча-сялянскай моладзі: п'янства, хуліганства, частковае працівапастаўленьне асабістых інтарэсаў грамадзкім і г. д.

3. Пленум ЦК Комсамолу Беларусі адзначае вялікі рост самадзейнасьці комсамольскіх мас і вялікае прыстасаваньне саюзнага кіраўніцтва у напрамку здавальненьня здаровых разнавідных запытаньняў моладзі.

Пленум ЦК Комсамолу Беларусі ўхвалае рашэньня 3 га Пленуму ЦК УсеЛКСМ аб паляпшэньні форм і мэтодаў саюзнага кіраўніцтва і аб разьвіцьці масавай культурна-асьветнай працы. Лічыць гэтыя рашэньні своечасовымі і забясьпечваючымі правільны напрамак усёй саюзнай працы ў далейшага ажыцьцяўленьня.

Вызначэньне крызысу росту УсеЛКСМ дадзеныя 14 м зьездам Партыі ў гэты час прадаўжае быць у моцы. Саюз у сучасны момант мае масу дасягненьняў у справе ажыцяўленьня ўсей сваёй працы, але крызысу свайго росту яшчэ ня выжыў. Саюз знаходзіцца на шляху выжываньня свайго крызысу росту. Заява аб тым, што саюз выжыў крызыс росту—ёсьць заява ранячасовай і абмылковай, якая можа толькі замалёўваць яскравасьць пэрспэктыў далейшага разьвіцьця УсеЛКСМ.

Выходзячы з усяго сказанага, Пленум ЦК ЛКСМБ лічыць: палітычную лінію працы ЦК правільнай і практычную працу ўпаўне здавальняючай.

4. У грунт усёй далейшай працы ЦК УсеЛКСМ павінен быць паложаны прынцып праверкі выкананьня існуючых дырэктыў і пастаноў партыйных ворганаў, а неўстанаўленьне „новых палітычных проблем." Пытаньня абагульваньня і праверкі вопыту працы саюзу і яго распаўсюджваньне на усе організацыі як і раней павінны зьяўляцца грунтоўным напрамкам у працы ЦК УсеЛКСМ.

5. Далейшы рост комсамолу магчымы праз максымальнае разьвіцьцё масава выхаваўчай і экономічнай працы саюзу. Пленум адзначае правільнасьць і своечасовасьць рашэньняў Арг. Бюро ЦК УсеКП па пытаньню аб росьце комсамолу і яго рэгуляваньня ў вёсцы. Далейшае паніжэньне проценту пролетарскага асяродку ў саюзе пагражае цэлым шэрагам небясьпек. З гэтаю мэтаю праверка і ўзмацненьне працы праграмных арганізацый павінны стаць чарговай задачай працы ЦК УсеЛКСМ. Узмацненьнем працы па ўцягненьню рабочае моладзі саюз павінен больш пранізваць усю практычную дзейнасьць ЦК.

6. Экономічная праца саюзу як ніколі павінна стаць масавай. Неабходна яшчэ больш зьвярнуць увагу на ўдзел комсамолу ў працы профсаюзаў і на дапамогу па ажыцяўленьню іх дзейнасьці.

У цэнтры экономічнай працы саюзу павінны быць пытаньня адукацыі вытворчага вывучэньня рабочае моладзі. Пры гэтым галоўным практычным пытаньнем работы павінна быць прыцягваньне увагі гаспадарчых ворганаў к пытаньням вывучэньня.

7. Адзначаючы маючыся дасягненьні ў галіне павялічэньня ўдзелу комсамольцаў у конкрэтных відах соцыялістычнага будаўніцтва, як та: падняцьце вытворчай працы, рацыяналізацыя вытворчасьці, правядзеньне рэжыму экономіі, падняцьце сельскай гаспадаркі, узмацненьне працы па кооперыраваньню сялянскіх гаспадарак і г. д., высоўвае неабходнасьць пашырэньня і паглыбленьня гэтай працы, уцягваючы комсамольскія масы ува усю штодзённую дзейнасьць па соцыялістычнаму будаўніцтву і выхаваньню комсамольцаў на грунце іх практычнага удзелу ў паасобных відах будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне.

8. Пленум ЦК Беларусі зварочвае ўвагу ЦК УсеЛКСМ на цяжкае становішча піонэрскай організацыі і яе кіруючых кадраў. Лічыць неабходным тэрміновага прыняцьця належных крокаў, забясьпечыць глыбокі зьмест працы піонэрскай організацыі, прыстасаваньне ўсяго зьместу да паасобных дарослых піонэраў і падвяцьненьне большай матар'яльнай базы пад піонэрскі рух.

Прэч крывавыя расправы над працоўнымі Заходняй Беларусі.

Рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі протэстуюць супроць панскіх зьдзекаў!

У Заходняй Беларусі



Зямля

Бурнае пасяджэньне польскага сойму.

25-га студзеня было пасяджэньне сойму. Гаварылі аб выдачы дэпутатаў Беларускай Грамады.

Выступіўшы ў парадку спрэчак дэпутат беларускае грамады Сабалеўскі—адзіны застаўшыся на волі—быў спатканы гучнымі воплескамі і галасамі:

„Няхай жыве Грамада"!

Сабалеўскі выкарыстаў сваё слова, каб заявіць востры протэст супроць арышту беларусаў і пасьля двух разовае перасьцярогі быў пазбаўлены слова. Гэта выклікала вялікі протэст сярод нацыянальных меншасьцяў.

Пад агульныя гукі і варожыя выкрыкі па адрасу міністра юстыцыі Мэйштовіча на трыбуне зьявіўся комуніст Сахацкі. Ад імя беларускае, украінскае, незалежнае, сялянскае і комуністычнае фракцый

Сахацкі падаў вотум недавер'я ураду.

За матываваньне гэтае прапановы ён быў пазбаўлены слова.

Вышаўшы на трыбуну Бартэль быў спатканы варожай абструкцыяй. Першыя яго словы выклікалі абурэньне. Ваявудзкі з месца крыкнуў:

„Дзе доказы"?

За шматразовыя выкрыкі па адрасу Мэйштовіча і Бартэля, Ваявудзкі быў выключан у пачатку з трох пасяджэньняў, а потым на адзін месяц.

У Заходняй Беларусі



Грамадзкія павіннасьці

Конфіскацыя грошай Грамады.

У часе рэвізіі ў віленскім беларускім банку польская ўлада налажыла арышт на бягучы рахунак Беларускае Сялянскае-Рабочае Грамады, на якім было каля 50000 злотых. (Злоты—23 кап.)

Дырэктар беларускага банку ў Вільні арыштованы.

Дэманстрацыя арыштаваных беларускіх дэпутатаў.

„Усходняе агэнцтва" паведамляе, што арыштаваныя дэпутаты Беларускае Сялянска-Рабочае Грамады Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі, якія знаходзяцца ў Лукіскай турме, наладзілі 18 студзеня дэманстрацыю. Дэпутаты паламалі сталы і нары ў турэмнай камэры, ня слухаюцца турэмнае адміністрацыі і патрабуюць тэрміновага вызваленьня.

У Заходняй Беларусі



Школа

АН. ЗАМЕЖНЫ.

У дэфэнзыве*)

Палачы, акупанты, фашысты,
„Здраду" хочаце вырваць з жыцьцём.
Мае раны пад вашым біцьцём
Загамоняць больш цьвёрда, вагніста,
Што ня выдам братоў палачом.

Выдумляць горшы зьдзек, катаваньне
Не патрэбны турботы для вас.
Што мне боль, калі ў гэты я час
Палыхаю жаданьнем паўстаньня
Шматмільёных прыгнечаных мас!

Хоць вы сэрца на часткі парвіце,—
У кожнай частцы жыць і буду, каб
[illegible] мсьціць,
Помсты нашай нічым не згасіць.
Блізкі час, калі мы бліскавіцай
Тут запалім часы навальніц.

*) Верш высланы з Зах. Беларусі.

У Заходняй Беларусі



Воля

У Заходняй Беларусі



Адміністрацыя

Польшча рыхтуецца да вайны.

Бюджэт польской дзяржавы на 1927 28 г. на 22 проценты большы ў параўнаньні з 1925 годам. Гэта павялічэньне ўлада лічыць неабходным у выпадку ўзросту цэн. Бюджэт вайсковага міністэрства ў параўнаньні з прадназначэньнямі і адпускамі ў 1926 годзе вырас на 39 мільёнаў злотых (1 злот—23 капейкі), што выклікана, галоўным чынам, павялічэньнем пэнсіі афіцэрам і ўнтэр-афіцэрам, гэтае павялічэньне пэнсіі праведзена па настаяньню маршала Пілсудзкага.

Прамысловасьць вывучаецца замежнымі місіямі.

Увага да організацыі вайсковай прамысловасьці і забясьпячэньню яе работы ў вайсковы час не слабее. Абгаварваюцца пытаньні аб вывазе ў мірны час некаторых відаў сырцу і фабрыкатаў вайсковай прамысловасьці. З гэтага пункту погляду неабходна спыніцца на прыездзе ў лістападзе месяцы ў Польшчу вайсковай місіі Паўднёва Славіі, пад старшынством Літвіновіча. Гэтая місія павінна была наведаць Верхнюю Сілезію тэксьцільную прамысловасьць Лодзі, фабрыкі самаётаў Пазнані, фабрыку снарадаў у Рэмбертаве і кончыць свою паездку наведваньнем Вільні. Мінулым летам вайсковая прамысловасьць Польшчы была вывучана такой жа самай місіяй Румыніі.

Наведваньне Верхняй Сілезіі зьвязана, мусіць, з пытаньнем вывучэньня хэмічнай прамысловасьці. Для вайсковай прамысловасьці гэтага тыпу найважнейшымі зьяўляюцца: порах, выбуховыя рэчы, баявыя газы і гэтак далей.

Будуецца вайсковы марскі флёт

У лістападзе месяцы ў Кракаве закончаны пабудовай два вайсковых моніторы (маторныя лодкі, разьмерам 35 мэтраў у даўжыню, 6 мэтраў у шырыню).

Узбраеньне іх складаецца з 2-х пушак 75 міліметраў пастаўленых у бранявой башні і аднае 10 санціметравай гаўбіцы. Моніторы з посьпехам могуць скарыстоўвацца для абароны марскіх берагоў і для вайсковых дзей па рэках. 2-лістапада па раццэ Віслье гэтыя моніторы прыбылі ў Варшаву, дзе пры вялікім зборышчы, яны перададзены ў склад марскога вайсковага флёту.

Інжынэр лётчык Багатыроў пабудаваў модэль гліссэра (лодка, якая пры дапамозе паветранага пропэлера выцягваецца з вады на сушу, хутка пасоўваецца ўперад) Гліссер можа ўзбраяцца кулямётамі і браць да 12 чалавек пасажыраў. Для абароны марскіх берагоў і для дзей на рэках ён зьяўляецца вялікай каштоўнасьцю.

Ужо ў працягу некалькіх месяцаў робіцца збор сродкаў на пабудову падводнай лодкі імя маршала Пілсудзкага. 7 лістапада скончаны перамовы з французскай фірмай „Кампарія марскога ўзбраеньня" аб набыцьці для Польшчы 5 судоў агульным вадазьмяшчэньнем 15.000 тон (1 тона 62 пуды). Агульная каштоўнасьць вызначана 150.000 фунтаў сьцерлінгаў (1.500.000 рублёў), якія ўносяцца ў працягу пяці гадоў.

Авіяхім—апора мірнай працы і вартаунік СССР

Пачынаецца набор у авіяшколы.—Чытайце умовы прыему.

Трэба умець абараняцца!

Неабходна, каб кожны рабочы і селянін ведаў працівагаз, яго пабудову і карыстаньне ім. Неабходна, кая ён мог карыстацца сродкамі колектыўнай абароны—газапрытулкамі, якія вельмі неабходны будуць у кожным насялёным пункце ў часе вайны.

Кожны рабочы і селянін павінен паклапаціцца над пытаньнем прыстасаваньня свайго памяшканьня пад газапрытулак, а для гэтага трэба ведаць, што з сябе ўяўляюць газы, якія будуць ужывацца ў часе вайны.

Хлор і фосгэн—у імпэрыялістычную вайну.

Мы ведаем, што ў мінулай вайне ўжываліся газы, якія дрэнна адбіваліся на дыхацельных органах чалавека (хлор, фосгэн і г. д.), сьлёзатачывыя ўплываюць на сьлізістую абалочку вока, могуць нават асьляпляць чалавека пры вялікай концэнтрацыі гэтага газу, атрутавыя газы, пры якіх сьмерць наступае ў працягу 15 секунд (сінільная кіслота) нарыўныя газы, якія выклікаюць вялікія абжогі на целе і пранікаюць нават праз вопратку (гарчычны газ). Гэтая матэрыя вельмі атрутная і ў будучай вайне будзе шырока ўжывацца, з гэтай прычыны, што яна амаль не раскладваецца ў вадзе і памалу выпараецца з паверхні.

Ня маючы працівагазаў могуць быць выпадкі атручваньня ад гэта газу.

У адносінах прыстасаваньня свайго памяшканьня дзеля абароны ад вранікаваньня гэтых газаў трэба або можна рэкомэндаваць наступнае:

Трэба каб у памяшканьне ня мог пранікаць газ. Усе шчыліны, праз якія можа праходзіць паветра былі-б добра зачынены. Дзьверы трэба завесіць асаблівай фіранкай, прамачыўшы яе належным лугам. З вокнамі прарабіць тое-ж самае. Каміны зачыняюцца. У часе газавай атакі ніхто не павінен выходзіць з памяшканьня. Выйсьці з памяшканьня можна толькі пасьля сігналу які будзе сьведчыць аб тым, што часу ўжо няма. Для таго каб быць падрыхтаваным да паветранай і хімічнай вайны, неабходна атрымаць хімічную граматнасьць праз ячэйкі ТСА Авіахэм і добраахвотныя авіяхэмічныя каманды.

Добраахвотныя авіяхэмічныя каманды організуюцца пры фабрыках, заводах і ячэйках ТСА Авіахэму, дзе яны будуць праводзіць абучэньне па пытаньням абароны ад газаў і аб саміх газаў.

Астроўскі.

Рабоча-сялянская моладзь у авіашколы.

Пытаньне комплектаваньне авіацыйных школ зьяўляецца адным з важнейшых відаў падрыхтоўкі да паветрана-хімічнай абароны. Неабходна адзначыць, што цяга ў авіяшколы з боку моладзі вялікая, але многія з іх не знаёмы з умовамі паступленьня. Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" атрымала наконт гэтага шэраг запытаньняў, на якія і дае адказ ніжэй друкуемым матар'ялам.

Ваенна-тэорытычная школа ваенна паветраных сіл.

Падрыхтоўка лётнага складу падзяляецца на 3 ступені: тэорытычная падрыхтоўка, абучэньне палётам і баявая падрыхтоўка. Каб атрымаць званьне ваеннага лётчыка неабходна паступова прайсьці вызначаны тып трох школ: 1) ваенна-тэорытычную, 2) ваенную школу лётчыкаў і 3) школу паветранага бою.

Набор у ваенна-тэорытычную школу жадаючых абучацца лётнай справе адбываецца 3 разы ў год—у лютым маі і жніўні месяцах.

Уся праца падбору кандыдатаў (не камандзіраў РККА) адбываецца выключна Авіяхімам, сама школа асобных пэрсональных прыёмаў ня робіць.

Як паступіць у авіяцыйную школу.

Паступіць у ваенна-тэорытычную школу можа ўсякі працоўны, жадаючы працаваць у чырвоным паветраным флёце. Для гэтага неабходна наступнае: 1) жаданьне зрабіцца лётчыкам, 2) добрае здароўе, пры наліччы бездакорнага зроку, слуху і добрай работы сэрца, 3) узрост ад 20 да 23 год, 4) адпаведны грамадзка-політычны ўзровень для нясеньня званьня ваеннага лётчыка і камандзіра РСЧА, і 5) агульна адукацыйная падрыхтоўка ня ніжэй ведаў сямігадовай працоўнай школы, асабліва патрэбны добрыя веды матэматыкі і фізыкі.

Пры наліччы пералічаных даных, усякі жадаючы павінен падаць заяву ў належнае акруговае аддзяленьне ТСА Авіяхіму і прыкласьці водзыў партыйнай, комсамольскай альбо профэсыйнай організацыі, альбо рэкомендацыю асобных сяброў КПБ, характэрызуючых адпаведнасьць паступаючага ў школу кандыдата. Да заявы павінны быць прыкладзены дакуманты, якія сьведчаць узрост і атрыманую адукацыю, а таксама сяброўскі білет Авіяхіму.

З моманту падачы заявы з усімі дакумантамі, падаўшы лічыцца кандыдатам школы.

Парадак адбору кандыдатаў і харчаваньне апошніх.

Таварышы падаўшыя заявы аб жаданьні паступіць у ваенна-тэорэтычную школу выклікаюцца акруговай адборачнай камісіяй Авіяхіму, праз раённыя аддзяленьні і ячэйкі асобнай абвесткай.

Усе выдаткі (праезд, харчаваньне, кватэра) кандыдаты нясуць за свой кошт, як у час прыёму адборачнай камісіяй Акр. Авіяхіму, так і да месца жыцьця ў выпадку, калі яны ня будуць мець усяго належнага да ўмоў прыёму.

Кандыдаты прызнаныя годнымі адборачнай камісіяй Акравіяхіму, накіроўваюцца адной камандай, забясьпечваюцца дармовым праездам па літару форма № 1 у вайскова акруговую адборачную камісію ў г. Смаленск. Харчуюцца да прыбыцьця ў Смаленск на свой кошт.

Кандыдаты прыбыўшыя ў г Смаленск размяркоўваюцца ў інтэрнаце і залічваюцца на харчаваньне пры адной з вайсковых частак.

Кандыдаты, прынятыя ў Смаленску, накіроўваюцца камандамі ў Цэнтральную Прыймовую камісію ў гор. Ленінград, забясьпечваюцца дармовым праездам і сутачнымі па 50 кап. у дзень за кошт Авіяхіму на ўсю дарогу.

Перавыбары сельсаветаў.

Комсамольцы-сельсаветчыкі будуць добрымі працаўнікамі!

Выбралі надзейных людзей.

У сельсавет прашло 3 комсамольцы.

(Быччанскі сельсавет, Барысаўскі раён).

Выбары ў сельсавет па ўсім нашым вёскам ужо скончаны. У выніку з 9 сяброў у сельсавеце—3 комсамольцы і 2 комсамольцы кандыдатамі у сябры сельсавету.

У вёсцы Бычч ў сельсавет абран комсамолец Еранкевіч Панцялей. Ён малады яшчэ комсамолец—самастойны гаспадар, але аўторытэтны сярод сялян і сяляне абралі яго аднагалосна.

У вёсцы Студзёнка комсамолец—быўшы сакратар сельсавету таксама абраны аднагалосна.

У в. Мала-Стахаў адзін комсамолец абраны ў сябры і комсамолка ў кандыдаты.

Сельсавет налічвае дзьве комсамольскія ячэйкі. Яшчэ перад выбарамі гэтыя ячэйкі сумесна з парт'ячэйкай разглядалі асоб, якіх потым і раілі ў новы склад сельсавету. На выбарчых сходах гэтыя кандыдатуры прашлі за выключэньнем некаторых.

Наогул, у склад сельсавету прашлі працаздольныя таварышы.

Застаецца толькі пажадаць, каб ячэйкі добра кіравалі працай сваіх выбраных комсамольцаў.

М.

Пашырым актыўнасьць жанчын.

(Коўбча, Клічаўскі р., Бабруйская акруга).

15 студзеня ў вёсцы Коўбчы адбыўся прадвыбарны сход сялянак, скліканы комсамольскай ячэйкай.

На сход прышло чалавек 60 жанчын і дзяўчат.

На сходзе стаялі пытаньні:

— Удзел сялянкі ў савецкім будаўніцтве і

Справаздача старшыні сельсавету

Уважліва выслухалі даклад. Па першаму пытаньню было пададзена некалькі запытаньняў. Пасьля гэтага сялянкі актыўна выступалі ў спрэчках аб удзеле сялянкі ў савецкім будаўніцтве.

Па справаздачы старшыні сельсавету жанчыны асабліва праявілі сваю актыўнасьць. Цікавіліся пытаньнямі разьмеркаваньня зямлі, закранулі шмат іншых гаспадарчых пытаньняў.

Сялянкі засталіся здаволены сходам і комсамольскай ячэйкай, якая сход склікала.

М. К.

Культурна-масавая праца комсамолу.

Даклад тав. Ратизра на 4-ым пленуме ЦК ЛКСМБ

(Канец. Пачатак глядзі у мінулым нумары).

ЦК у бліжэйшы час паставіць ува ўсёй шырацы перад Галоўпалітасьветы пытаньне аб кіраўніцтве самаадукацыйнай працай сярод моладзі. Наша адукацыйная і самаадукацыйная праца павінна дапамагчы рабочай моладзі ў павышэньні сваёй кваліфікацыі, сялянскай — у атрыманьні агрономічных ведаў. З гае прычыны мы падкрэсьліваем асаблівую важнасьць вытворча-тэхнічных і с-г гурткоў. Трэба забясьпечыць кіраўніцтва гэтымі гурткамі, дапамогу ў практычнай пастаноўцы іх працы, у прыцягненьні адпаведных культурных сіл. Трэба праверыць як выконваюцца маючыяся пастановы аб кіраўніцтве с-г гурткамі з боку органаў Галоўпалітасьветы.

Аб політычна-вытворчай пропагандзе.

У рэзолюцыі па гэтаму дакладу паказаны галоўныя моманты і задачы нашай масавай працы ў гэтым напрамку. Адносна формаў трэба падкрэсьліць: задачу паляпшэньня зьместу і кіраўніцтва, — політднямі моладзі, асабліва ў вёсцы. Трэба шырэй скарыстоўваць у ячэйках, юнсэкцыях, хатах-чытальнях, — вечары пытаньняў і адказаў, якія сябе апраўдалі і праходзяць пры значнай актыўнасьці моладзі. Я зварачваю Вашу ўвагу на справу організацыі вытворчых сьвят, якія ўключаюць у сябе моманты выпярэдніцтваў моладзі. Я ўжо казаў аб працы тэх. і с-г гурткоў, Адносна вёскі мы асабліва падкрэсьліваем вялікую важнасьць праведзеных у шэрагу організацый нарад комсамольцаў-самастойных гаспадароў. Трэба гэтую працу плянамерна і ўпарта працягваць. Трэба рашуча выканаць дырэктывы Красавіцкага Пленуму ЦК ЛКСМБ аб скарыстаньні комсамольскімі організацыямі навуковых вопытна-паказальных установ, іх культурных сіл. Напрыклад, Менскі АК да гэтага часу не скарыстаў такой ўстановы як балотная станцыя.

Нацмоманты у культ-масавай працы.

У нашых умовах вялікае значэньне мае прыстасаваньне нашай культурна масавай працы да абслугоўваньня моладзі на роднай мове. Мы маем вялікія дасягненьні ў гэтай галіне. Трэба іх замацаваць і пашыраць. Нам ўяўляецца цяпер асабліва важным вылучэньне нашымі організацыямі большай ўвагі антырэлігійнай пропагандзе, барацьбе з уплывам клерыкалізму на моладзь, асабліва сярод яўрэйскай і польскай моладзі. Мы павінны ўсёй нашай культурна-масавай працай садзейнічаць практычнаму ажыцьцяўленьню нац. політыкі партыі, больш прыцягнуць нашы комсамольскія організацыі да ўдзелу ў культурным будаўніцтве. Трэба стала растлумачыць комсамольскай масе задачы партыі ў культурным будаўніцтве, у будаўніцтве нацыянальнай культуры, „пролетарскай па зьместу, нацыянальнай па форме.

„Мы яшчэ раз падкрэсьліваем задачу палепшэньня кіраўніцтва філіямі „Маладняка" на мясцох, дапамогу «Маладняку» ў політычным выхаваньні яго сяброў, задачу ўважлівага азнаямленьня комсамольскага актыву і комсамольцаў з літаратурнай творчасьцю маладнякоўцаў, дапамогі па організацыі таварыскай крытыкі, якая дапаможа выхаваньню з маладнякоўцаў, пролетарскіх поэтаў і пісьменьнікаў.

Такая дапамога павінна быць забясьпечана літаратурнай групе, «Юнгер Арбэйтэр» і «Зьвеньням». Трэба таксама праверыць удзел комсамольскіх організацый ў працы краязнаўчых гурткоў прыняўшы меры для большага ўцягненьня моладзі ў працу гэтых гурткоў.

Патрэбна больш цесная сувязь з політасьветамі і профсаюзамі.

Паглыбляючы культурна-масавую працу сярод моладзі нам неабходна цяпер асабліва ўстанавіць практычны дзелавы кантакт з Галоўпалітасьветай, яго органамі на мясцох і з профсаюзамі, забясьпечыўшы больш глыбокае і поўнае абслугоўваньне з іх боку культурных запатрабаваньняў моладзі ў цеснай сувязі з комсамольскімі організацыямі.



Што выявіў мэдагляд рабочай моладзі ў 1926 г.?

Б'ем трывогу.

Большая палова рабочай моладзі хворыя. Процант сухотнікаў у 1926 г. павысіўся да 10,7 з агульнага ліку рабочай моладзі. Неабходна тэрмінова распачаць аздараўленчую кампанію. Ячэйка—цэнтр працы па аздараўленьню. Што сказала ў гэтых адносінах экономнарада пры ЦК ЛКСМБ.

Мэдыцынскі агляд у 1926 годзе прашоў па ўсёй Беларусі з вялікім уздымам, ён бязумоўна, павінен быў зачапіць любога працуючага падростка ў горадзе, мястэчку, у вёсцы.

11.590 чалавек да 20 год прашлі гэты агляд, у той час, калі ў 1924 годзе прашло толькі 3811 у 1925 г. 8648 чалавек.

Гэта першае дасягненьне ў мэдаглядзе 1926 году

Далей, калі ў 25 годзе дзяўчаты складалі 26,1 проц., дык у 1926 г. іх ужо больш—30,6 проц., калі у 1925 г. падросткаў было ахоплена 5895 ч. дык у 1926 годзе падросткаў ужо 7724 больш амаль што на 2000 чалавек.

Нацыянальны склад грамадзкіх працаўнікоў дае такі малюнак: павялічэньне беларусаў у параўнаньні з 1925 годам (у 1925 годзе—24,1 проц., у 1926—30,3 проц. і нязначнае паменшэньне яўрэяў (1925 г.—58 8 проц. 1926 г.—54,7 проц.) але ня гледзячы на гэта нагляд ецца ў абсолютных лічбах рост яўрэйскай моладзі (у 1925 годзе—4064, 1926—6344)

Цікавыя весткі аб профэсыянальным складзе рабочай моладзі.

На першым месцы ідуць мэталісты—1636 чалавек ці 14,1 проц., на другім месцы ідуць служачыя—1160 ці 10 проц., на трэцім месцы дрэваапрацоўчыкі 995 чал. ці 8 6 проц., потым швэйнікі—962, шаўцы—870 і г. д.

Цікава адзначыць, што дасягненьне 1926 г у параўнаньні з 1925 у сэнсе ахопу асобных груп моладзі кладзецца на тыя профгрупы, якія ў 1925 годзе былі прадстаўлены ў нязначнай колькасьці. Да прыкладу, калі ў 1925 годзе было агледжана 600 гарбароў, дык у 1926 годзе—843 Хімікаў у 1925 годзе—394, у 1926—772. Сельска гаспадарчых рабочых у 1925 годзе—125, у 1926 г. 637. Харчаўнікаў у 1925 г.—227, у 1926 г.—382 Друкароў у 1925 г.—135 у 1926 г. 139 і г. д.

Зьвернемся зараз да пытаньня аб хваравітасьці рабочай моладзі Беларусі. Вось што дае гэты агляд.

Большая палова рабочай моладзі —57,3 проц. хворыя тэй ці іншай хваробай. Яшчэ да гэтага часу такога вялікага проценту не наглядалася калі нават адкінуць малакроў'е —19,9 проц (бо гэтая „хвароба" амаль у кожнага падростка. Малакроўе быццам бы немінучы спадарожнік маладога узрастаючага організму) дык мы атрымаем ня меншую лічбу, якая прымушае сур'ёзна падумаць над аздараўленьнем рабочай моладзі.

Раўнаючы процант хваравітасьці ў нас ў Беларусі, з процантам хваравітасьці ў Маскве мы атрымоўваем наступны малюнак: у Маскве агульны процант 43,1, у нас 57,3. Калі узяць хваробу малакроўя дык у нас—37 4 проц., у Маскве—24,4 проц.. Возьмем хваравітасьць па іншых галінах. Да прыкладу сухоты. Гэтая хвароба самы лепшы паказчык становішча здароўя, і што мы бачым. У 1925 годзе ў БССР моладзь хворая на сухоты складае—8,1 проц., у 1926 г.—10 7 проц., у той ч с калі сярэдні процант сухотнікаў — 6-7 процантаў. Рабочай моладзь Масквы хварэе сухотамі толькі 6,5 проц.. з агульнага ліку прашоўшых мэдагляд

Другія хваробы не даюць лепшага малюнку. Цікава адзначыць, што па нацыянальнасьцям мы маем цікавую розьніцу хваравітасьці, напрыклад лік хворых сухотамі куды больш ў яўрэяў, (11,3 проц.)

Аб чым гавораць такія лічбы? Што трэба зрабіць у гэтых адносінах. На першае пытаньне можна адказаць. На другое пытаньне трэба сур'ёзна падумаць. Экономнарада, якая адбывалася гэтымі днямі па гэтаму пытаньню сказала сваё слова.

Досыць гаварыць аб высокім проценце хваравітасьці. Патрэбна практычная праца па аздараўленьню моладзі. Коратка шляхі такія:

Замацаваць процант месц у дамох адпачынку і на курортах, якія выдзелены пастановай ЦСПСБ ад 8-га красавіка 26 году на летні і зімні пэрыоды

Вылучыць процант месц ва ўсе профілактычныя ўстановы Наркамздароўя: дыэтычныя сталоўкі, начныя і дняўныя санаторыі.

Барацьба за асабістую гігіену комсамольца і маладога рабочага.

Узмацніць працу прадстаўнікоў комсамолу ў органах НК аховы здароўя.

Разгарнуць шырокую санітарна-асьветную працу сярод рабочай і сялянскай моладзі ў комсамольскіх клюбах і юнсэкцыях.

Фізкультура ў 24 гадзіны.

Гарачыя сьнеданьні ў школах ФЗУ.

Цэнтр аздаравіцельнай працы—ячэйка Комсамолу.

Сувязь з дыспансэрамі дзяцей і падросткаў з сухотнымі дыспансэрамі.

Вось, што сказаў па гэтаму пытаньню Комсамол. Выконваньне гэтых задач трэба адразу распачаць.

В. БРАДОЦКІ.

Літаратурная старонка

Выходзіць штотыднёва пры бліжэйшым удзеле Ўсебеларускага Аб'яднаньня Поэтаў і Пісьменьнікаў „Маладняк“.

А. Якімовіч.

У весны.

Мне ўсё так дарага і люба тут
У гэтай сіняй цішыне палёў!
Спакойным, бяз трывог, па іх я йду
Спаткаць вялікай будучыны лёс.

Лятуць жаданьні, й на ўздагон ляцець
За імі хочацца, як колісь між бяроз,
Каб папярэдзіць сваю цень
І расьсьмяяцца аж да сьлёз.

Адчуць у дзіўным харастве
Палі, бязьмежнасьці гаёў,
І прывітаць іх першы цьвет
На шмат гадоў,
На шмат вякоў!

* * *

Вясна, вясна...
Як матылькі, пушыцца бель
Пад ветра ціхі перабор
Спакойна-плаўны хмаркі бег—
І адгукнуўся сіні бор.

Нядоўга-ж бедная яна
Тут красавалася жыцьцём,—
Яна радзілась, каб сканаць,
Калі ўдарыць першы гром.

Жыла і зьнікла, як і ўсё ў жыцьці,
І людзі добрыя не шкадавалі ўспамянуць!
— Як зелень зьзяе па дажджы наўзьдзіў!—
Патрэбна вільгаць у вясну!

Ды толькі ўсяго й было.
Але шкада, шкада, вось, мне:
Ня чула хмарка гэтых слоў,
Што заслужыла па сваёй вясьне.
Мне сёньня дзед скрозь бараду густую
Ўсьміхнуўся міла, як прамень з пад хмар:
— Эгэ, унукі спаткаў і я
Вясну жыцьця свайго другую...
І расквітнеўся твар яго, як мак.
— А помніш, мілы, мы з табою
Жылі... у лесе, як ваўкі...

. . . . . .

Жахлівых зданяў цені прада мною
Ўзьляцелі пырскамі кіпучае ракі...
— Скажы-ж, мой родны, кажуць— зноў пачнецца!
Ангельцы палякоў шлюць...
К нам на Беларусь,
І прыдуць з „батам“ немцы!?

. . . . . .

— Ах, дзераш, дэраш мой!
Напэўна забярумь...
І абвіла мінулая туга маршчыны,
Бязмэтна вочы шчупалі гаі.
— О, край мой, край!
Хіба-ж ізноў ты раны ўсе адчыніш,
Каб іх навекі загаіць!?

* * *

Яшчэ ня стухлі зор чароды,
І сьпіць пад стрэхамі імгла,—
Пастух вітаньне дню паслаў,
Будзіў ён песьняю Усход.
Як вогульле,
З хлявоў нясецца ржаньне
Згусьціўся дзікі шум, нібы туман...
Даўно чакае каля стайкі
Мяне любімы мой Каштан.
— Сядай, Алесь!—найлепшая машына:
Куды скасуе твой ён лісапэд!—
Жартуе бацька,
Гладзячы каня крутую шыю
І весела ўсьміхаецца у вус сябе.
— Сягоньня будзе, брат, пагода:
Як дым, пасьцелецца ў палёх!
Паедзем грэчку сеяць «пад балота»—
Граччанікаў ужо, як матылёў!—
Ты будзеш з бараной хадзіць за мною,—
Каштан—маланка, а ня конь!
—Я згодзен, так...
І мары, думкі сьветлым роем
Зноў запалілі ў сэрцы радасьці агонь...

Мне ўсё так дарага і люба тут
У гэтай сіняй цішыне палёў.
Спакойным, бяз трывог,
Па іх я йду
Спаткаць вялікай будучыны лёс!

1926 г.

Наля Маркава

* * *

Над прасторам балот
расьціляўся туман
расьціляўся туман
ды пялёсткамі.

Ныраў вецер парой,
цалаваў вярбы стан,
цалаваў вярбы стан
буйным лёскатам.

У гэту сінюю ноч
калыхаліся вакол
калыхаліся вакол
песьні восені.

З перазвонам густым
зачараваны дол,
зачараваны дол,—
вёска ў просіні...

С. Пілipенко

ГАДЗІНЬНІК.

Карусь вельмі рэдка браў яго з сабою. Звычайна ён блішчэў сваёю крышкаю з невялічкай чорненькай пантофалькі якую сьпляла Карусю Ганна са свае смаляное касы.

Гэта было тады, калі Ганна, у часе вандровак коннай брыгады (дзе яна была сястрою), два зацяжных месяцы змагалася с тыфусам.

— Хоць гэтая пантофалька застанецца табе любы на ўспамін аба мне, Ганне...

Але засталася і пантофалька, і Ганну цалуе і цяпер Карусь, зьмяніўшы востраверхі шышак на рабочую кэпі.

Пра мінулыя крывавыя гады напамінае Карусю толькі срэбны гадзіньнік, на сподняй крышчы якога написана:

Гэрою Чырвонай Арміі т. Карусю
ад Рэвваенсавету Чырвонай
Коньніцы

А ў Ганны таксама рэліквія—маленькі, бы цацачка, наганчык. Не разлучалася яна з ім амаль што ніколі.

Карусь — латыш. У яго сінява-шэрых вачох знашло сабе адбітак неба з туманамі Латвіі, а з мягкай яго вымовы заўжды жартуе палтаўка Ганна.

Вось і цяпер на ваколіцы гораду:

— Пый тэнэ лыхая катына!—сярдуе раптам Карусь у цямноце, ускочыўшы нагою ў лужу.

А Ганна аж заходзіцца са сьмеху:

— Гэта каб каты лужу выпілі, ці цябе ліхая гадзіна пабіла, што ты гэткі недарэчны. Ідзі сюды, на ўзгорак, а сама казою паскакала упе рад... Ведома—моладзсьць!

— Хай тэпэ фцэр тохаянe!—жартаваў дзесьці ў цямноце Карусь, шукаючы сьцежку каля плоту.

А раптам з-за плоту:

— Стой! Рукі ўгору!

Паміж вачмі даўжэзны „шпаер“. Зладзейская рука шукае па кішэнях.

— Парожныя-бы царкоўная скарбонка! А баба хітралобая—ўцякла. А ну, пяткі ўгару, ды не азірайся, а не,—дык...

...Затрачаны дагнаў „хітралобую“. Пачала зьдзеквацца:

— Вось табе і гэрой коньніцы чырвонай. Добра, што ў штанах пакінулі...

— Топра, топра!—пачаў крыўляць ужо са злосьцю Карусь,—фсэ потарафалі. Фсэ эст...

— А гадзіньнік?—спытала Ганна.

— Ой!—памацаў у кішэнях—ныма...

Рашуча павярнуўся з замерам пайсьці назад.

— Карусік, любы, ня трэба! Ён цябе заб'е. Вазьмі хоць мой рэвольвэр... І я з табою, і я...

Павісла на руцэ, ня пушчала.

Карусь быў рашучым. Гэта-ж падарунак Рэвваенсавету. Гэта-ж здабыта яго крывёю. Гэты гадзіньнік ня можа быць у зладзейскіх руках. Ганьба яму, Карусю, калі ён не адбярэ гадзіньніка.

— Дзеля нашага каханьня! Дзеля ўсяго найдаражэйшага!...

Думка працавала гостра, празорліва. Тысячы няўзгод праплыло і цяпер шчасьлівае жыцьцё—а вось, на табе, на пустэльнай ваколіцы гораду, з за якогасьці злодзея страціць каханага. Нечым трэба адхіліць небясьпеку, знайсьці спосаб..

— Карусік, пагледзь,—там далей поля. Ён павінен вяртацца сюдою. Давай зробім і мы яму засаду, як ён быў зрабіў табе. Гэтак больш пэўна.

Згадзіўся.

Схаваліся за кустам. Толькі Ганна цёплаю рукою ляскава гладзіць шарахаватую руку Каруся,—а ў ёй чарнее маленькі наган.

Сярод цішы чутны крокі. Мармоча пад нос зухвацка і весела:

Я ў турме, ды ня бываў
Чум-чура, чара-га!
Ад міліцыі ўцякаў—
Ку-ку ха-ха!

Раптам з за кусту:

— Ні з месца! Рукі ў гору!

Пад самыя вочы-наган. Моцнаю рукою за грудкі. Дзьве маленькіх—па кішэнях.

— Фцікай тэпэр насат, а нэ, дык—кулю! Ну?

...«Шпаер» у Каруся. Дзівючыся, са злосьцю кідае у лужу. Пераконана кажа Ганне:

— Я— турны. Гэта нэйкая іржавая тутка.

— І дадаў апраўдальна: але тэмпа пыла, так тэмна...

Бандыт дзесьці далёка ўцякаў па лужах лаючыся ў голас, а Ганна ва ўсе грудзі рагатала з вінаватага воглядy свайго паўночнага гэроя.

— На табе, гэрой, твой гадзіньнік, ды бахні хоць раз з нагану, каб той не падумаў, быццам і мы дудкаю ваявалі.

— Сама спалохалася, а цяпер зьдзекі ладзіш.

— Зьдзекуюся, каб вочы лепш глядзелі.

... Перакідваючыся жартамі, успамінаючы кожны міг са здарэньня, дашлі Карусь і Ганна да хаты.

— Памыйся ідзі, злодзі з гасьцінцу, а я тым часам вячэру прыгатую. Чаго як слуп стаіш?

Дзіцячымі вачмі глядзеў Карусь на сьценку каля ложака. Рука нэрвова шоргалася ў кішэні, шукаючы штосьць.

Ганна моўчкі глянула на сьценку, дзе з чорненькай пантофэлькі выглядала крышка Карусёвага гадзіньніка.

Ён вельмі рэдка браў яго з сабою.

Пераклаў з украінскай
Іл. Барашка.

«Плужанін»

Юрка Лявонны.

Лілевыя мотывы.

Ой, Марыля, мая ты Марыля!
Мо' таму, што прышоў я з паўдня,
Што кахаеш мяне ты адна,—
Я падняўся на сонечных крыльлях—
Ой Марыля, мая ты Марыля!..

Мо' таму, што прышоў я з паўдня,
Дзе пад стэпам—і зоры і вецер—
Над травой—у блакітнай карэце,—
Хочу сьвет у загрудзьдзі уяьнянь..
Мо'—таму, што прышоў я з паўдня?..

Што кахаеш мяне ты адна—
Мне сказала шаўковае раньне...
Не дарэмна чакаў я сьвітаньня,
Бо на сьвеце адно толькі знаў:
Што кахаеш мяне—ты адна...

Я падняўся на сонечных крыльлях—
Можа хутка к табе не зьвярнуся...
Але вабіць прастор Беларусі
І дачка яе—кветка Марыля..
Я падняўся на сонечных крыльлях!

Ой, Марыля, мая ты Марыля!
Я сягоньня ізноў табой п'яны...
Хочу зноў агнявога спатканьня,
Як вярба з туманамі сівымі...
Ой, Марыля, мая ты Марыля!..

Пісьменьнік, кніга і чытач.

«Красная Новь“ (№ 1—1927 г.) зьмясьціла досыць спрэчны артыкул А. Варонскага „Писатель, книга читатель“, у якім аўтар робячы падрахункі мастацкай прозы за 1926 г. адзначае з пункту погляду чытача, што расійская мастацкая проза „вплотную не падошла к современной действительности, к тому, что носится в воздухе и ждет своего художественного оформления“.

Усё ж такі чытач падначальвае сабе пісьменьніка і ў першую чаргу маладога пісьменьніка кастрычнікаўскага і пасьлякастрычнікаўскага пэрыоду, якія ў сваіх творах адбіваюць сучаснасьць.

Але па думцы А. Варонскага, большасьць аповесьцяй, апавяданьняў, вершай расійскіх маладых белетрыстаў і поэтаў маюць адзін грунтоўны недахоп,—у іх пераважае вонкавы, няглыбокі падчас проста апісальны падыход да свэіх тыпаў, падзей. Ім нехапае органічнага падыходу.

І А. Варонскі кажа: „надо повести борьбу за органический метод в художестве. Нужно научиться изображать людей и события в диалектическом процессе, в живой, в жизненной динамике их чувств, в становлении не отрываясь от бытия. Сейчас нужна такая школа, такое направление.“

І далей: „От описательства, от наивного натурализма надо шагнуть к хорошему, к настоящему реализму.“

Літаратурная хроніка.

Сярод пісьменьнікаў.

▣ Поэта Язэп Пушча рыхтуе да друку зборнік вершаў „Шум клёнаў поэ II“.

▣ Пісьменьнік Крапіва здаў ў друк зборнік баек (вершамі). Таксама ён рыхтуе да друку шэраг апавяданьняў.

▣ Народны поэта Янка Купала здаў ў друк 3-ці том збору твораў (п'есы). 4-ы том яго прызначаецца для драматычных поэм. Яшчэ здадзен у друк Я. Купалаю пераклад поэмы з польскай мовы „Эрос і Псыха“ (Жулаўскага).

Астаповіч.

Нататкі і заўвагі чытача*).

(Пра пісьменьніцкі маладняк).

У адным з апошніх нумароў солиднай расійскай часопісі „Печать и революция“ (№ 7—1926 г.) вядомым расійскім журналістым Вяч Палонскім пастаўлена рубам адно цікавае, сучаснае пытаньне, якое мы назіраем гэтак сама і ў нас на Беларусі. Гэта пытаньне аб нашым пісьменьніцкім маладняку.

Палонскі піша:

«Адбываецца адно гібельнае непаразуменьне Аб ім варта пагутарыць у нашай краіне, дзе пісьменьніцкі маладняк ідзе шырокім патокам, дзе адзін ВАПП налічвае ў сваіх шэрагах некалькі тысяч яшчэ невядомых пісьменьнікаў, а за імі стотысячныя армія рабкораў і селькораў, з якіх будуць—у гэтым і сумлявацца няма чаго—вылучацца яркія таленты. І ўсе яны, яшчэ не запрацаваўшыя права звацца пісьменьнікам, аддаюцца ўлэўненасьці, быццам пісьменьніцкай працай можна жыць.

«А гэта ня так. Гэта пагубная памылка. Малады які небудзь хлапчук напісаў некалькі яркіх вершаў. Рэдактар, узрадаваны, іх надрукаваў. Да няшчасьця для хлапца, якое-небудзь выдавецтва цiснула вершы асобным выданьньнем, крытык—зноў такі да няшчасьця юнака — крытык дображадацель, з шырокай нясутрымнасьцю напрарочыў яму будучыню. Ясная справа—у хлапца галава пашла навакол Хто сабе вораг—хто адвернецца ад будучыні, якая прарочыць славі, пачасьці, портрэт у штотыднёўку, артыкулы ў газэце, дзяржвыдатаўскія авансы, зборы твораў—мары, мары.., і атручаны наш юнак аж да сьмерці. Літаратурны яд, г. зн. яд літаратурнага славалюбія—адзін з найапасьнейшых ядаў. Ён з ліку тых, якія паступова забіваюць. І процівяддзій ад яго мала. Уцягнены посьпехам юнак, натуральна, кідае завод, майстэрню, кантору, нават ВНУ іншы раз кідае, пакладаючыся, быццам вершапісаньне альбо пісаньне апавяданьняў і нават романаў можа зразу зрабіцца яго профэсыянальным заняткам. Я не кажу ўжо аб тых, хто наогул па памылцы трапляе ў літаратуру. З іншага вышаў бы здольны бухгальтар, парыкмахар альбо па крайняй меры настаўнік арытмэтыкі ў школе II ступені, а яго пацягнула романы пісаць. Я маю тут на віду моладзь з літаратурным прызваньнем, талентам, з бліскам, заўтрашніх каханцаў чытача.

«Але сёньня, але сёньня...

„Што з ім будзе сёньня, калі яму няма куды прыхіліць галаў?

«У нас якась мала стараліся ўнушыць моладзі, што так глядзець на пісьменьніцкую працу — знача аддаваць сябе на верную пагібель. Ніхто не расказаў маладняку праўды аб тым, што пісьменьніцкая праца ніколі і нідзе не карміла сытна нават самых таленавітых пісьменьнікаў у часе першых крокаў іх літаратурнай працы. Тыя пісьменьнікі у Расіі альбо па-за межамі, якія маглі сабе дазволіць раскошу жыць так званай літаратурнай працай, на справе маглі рабіць гэта толькі таму, што былі забясьпечаны іншымі крыніцамі прыбытку. Гэта былі капіталы „папаш“ і «мамаш» альбо якая небудзь рэнта, прадпрыемства і г. д. Нашая моладзь ня мае паняцьця аб тым што пісьменьнік зможа існаваць сваёй літаратурнай працай толькі пасьля таго, калі імя яго набудзе популярнасьць, а напісана ім будзе шмат томаў, і тамы гэтыя будуць выдавацца і перавыдавацца. Пакуль-ж ён малады і збору твораў у яго няма, а тое, што ёсьць, не зьяўляецца прадметам „страстных издательских вожделений“—ён ахвярованы на галодную сьмерць альбо на профэсыйнае жабрацтва, калі ня знойдзе сабе якую-небудзь нелітаратурную крыніцу існаваньня. Існаваць аднэй літаратурай для пачынаючага пісьменьніка так лёгка, як лёгка пераплысьці аднаму праз Атлянтыцкі акіян.

„А нашая моладзь, да няшчасьця, хварэе іменна гэткай утопіяй“.

А ці ж няпраўда?

А ці-ж у нас, на Беларусі, не назіраецца гэтага? Назіралася, і нават цяпер назіраецца. І што-ж у выніку? кідаюць вёску, мястэчка, родны горад ідуць у сталіцу і там пры дапамозе аб'яднаньня, у лепшым выпадку знаходзяць такую-сякую пасаду, а ў канцы канцоў—кідаюць пасаду (бач, няма дзе разгарнуцца яго творчай дзейнасьці, за службай часу няма і як двойчы два—чатыры, садзяцца макам...

А ці-ж ў нас ня маюцца факты, калі пісьменьніцкая моладзь, захапіўшыся творчай дзейнасьцю, пакідала вучыцца ў вышэйшых навучальных установах, але праз тры чатыры, гады пачала нанава аднаўляцца ў правох студэнтаў і вучыцца бо ўгледзела, што слабейшыя за іх адзінкі, скончыўшы навуку, пачалі перарасьці іх, а першыя—ня тое, што стаялі на адным узроўні, але нават і здавалі свае позыцыі...

Гэта навука для другіх, малодшых...

А ці ня трапілі ў шэрагі пісьменьніцкага маладняка Савецкай Беларусі па памылцы некаторыя адзінкі, з якіх былі-б добрыя парыкмахэры альбо, у лепшым выпадку, як кажа Вяч. Палонскі, настаўнікі арытмэтыкі?

Трапілі. І іхняе захапленьне губіць самых іх. Яны „са скуры лезуць“ каб стаць „прызнанымі“, і ўрэшце такі толькі псуюць сабе здароўе, атручваючы жыцьцё літаратурным, чужым для іх, але пякучым ядам..

І няўжо-ж няма выхаду з гэтага становішча? Няўжо-ж няма тае ляйчыны, якую трэба даць у рукі пісьменьніцкаму маладняку з вёск?

Бязумоўна, выхад маецца. І выхад у тым, каб даць магчымасьць гэтаму пісьменьніцкаму маладняку з вёскі набыць у рукі профэсію. Зразумела, ня профэсію пісьменьніка, а профэсію таго ці іншага, карыснага для грамады, працаўніка (настаўніка, судзьдзю, фэльчара, агронома). Да таго, пісьменьніцкі маладняк сам прагне набыць (ужо адумаўшыся) яе.

Вяч. Палонскі піша:

„Пазьней, калі і чытач, і крытыка, і выдаўцы ацэняць рабочага пісьменьніка (мы дабаўляем—і сялянскага пісьменьніка), калі ён сам праверыць сябе гадамі сур'ёзнай працы, калі ён сасьпее да таго, што пераpыў пупавіны ня будзе для яго шкодным, толькі тады ён здолее ўзброіцца пяром на ўсе „100 проц.“, як у нас любяць цяпер казаць.

Спрачацца з гэтым ніхто ня стане.

*) Намі друкуюцца вытрымкі з артыкулу т. Астаповіча „Другі бок медалі“, які друкуецца ў № 1 часопісі „Маладняк“ (1927 г.) у парадку абгаварэньня. Рэд.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ

У Менакругкоме ЛКСМБ

Падрыхтоука да перавыбарау у Гарсавет

Менскі АК ЛКСМБ сумесна з Ляхаўскім райкомам вядзе падрыхтоўку да перавыбараў ў Гарсавет.

Рыхтуецца вялікі комсамольскі карнавал, які высьвятліць усю працу Гарсавету.

* * *

У нядзелю, 30-га студзеня, а 3-й гадзіне дню склікаецца нарада павадыроў фарпостаў і атрадаў па пытаньню падрыхтоўкі да перавыбараў ў Гарсавет.

Зьмена расьце

Па Менскай акрузе на 1-е сьнежня, 1926 году налічвалася: піонэратрадаў—221, піонэраў—7861, акцябрат—882.

Цікавы вопыт Ляхаукі.

Старыя формы працы ў колектыве павадыроў атрадаў пры райбюро ЮП, калі прачытывалася лекцыя кім небудзь і формальна прымалася рэзолюцыя,—сябе не апраўдалі.

Цяпэр райбюро ЮП пры Ляхаўскім райкоме ЛКСМБ дала другі напрамак працы колектыву,

Кожнаму павадыру даручаецца распрацаваць на паставе вопыту сваей працы асобнае практычнае пытаньне. На пасяджэньні колектыву заслухоўваецца яго інформацыя і пасьля абмену поглядамі кіраўнік колектыву рэзюміруе сказанае, падмяцняе гэта тэорытычнымі палажэньнямі.

Матар'ялы па кожнаму пытаньню рассылаюцца ўсім павадырам за тыдзень да пасяджэньня колектыву.

У канцы пасяджэньня пытаньне ў другі раз прапрацоўваецца шляхам „запытаньняў і адказаў".

У выніку наглядаецца большая карысьць ад працы колектыву.

* * *

Пры Ляхаўскім райбюро ЮП організуюцца курсы па падрыхтоўцы піонэраў інструктароў гурткоў радыёпрыхільнікаў.

Прыем на гэтыя курсы будзе праходзіць праз асобную разьверстку.

Як выхоўваецца маладая савецкая інтэлігэнцыя.

Што выявіў досьлед трох тэхнікумаў.

Наркамасьветы закончыў досьлед працы тэхнікумаў-музычнага, коопэрацыйнага і мастацкага.

У музтэхнікуме добра пастаўлена справа вывучэньня народных сьпеваў. Рыхтуюцца оперы на беларускай мове—„Русалка" і „Фауст". Заказаны заграніцай ноты і духавыя струманты.

Досьлед віцебскага коопэрацыйнага тэхнікуму выявіў значны рост апошняга за лік сялянскай моладзі.

Асаблівая ўвага зьвернута ў тэхнікуме на абсталяваньне коопэрацыйнага і гандлёвага габінэтаў. Выкладаньне на 1-м курсе на 80 проц. вядзецца на беларускай мове. Досьлед віцебскага мастацкага тэхнікуму выявіў пашыранае вывучэньне ў ім беларускіх краяведаў і народнай вопраткі. Выпрацаваныя слухачамі ўзоры пасланы ў Старасельскую ткацкую школу (Віцебшчына). Узоры для прамысловасьці (для сітцаў, палотнаў і інш.) выконваюцца вельмі добра і ўнесены ў курс гадавых заданьняў.

Нядаўна было адпушчана ўрадам 1.170 руб. на палепшаньне быту студэнтаў тэхнікуму.

Програмы зацьверджаны.

Пасьля доўгага часу камісіяй па вучнёўству пры Нар. Кам. Працы прагледжаны і зацьверджаны вытворчыя програмы навучаньня падросткаў.

Пакуль зацьверджаны програмы толькі для дрэваапрацовачнай, шкляной і папяровай прамысловасьці.

Навучаньне падросткаў па праграмах павінна распачацца на мясцох ад лютага м-ца.

Рамесьленыя школы.

Наркамасьветы распрацоўвае пытаньне аб рамесьленай асьвеце сярод вясковай і местачковай моладзі.

Школы гэтага тыпу (2—3 на акругу) будуць утвораны пераважна ў мясцовасьцях з належна разьвітаю прамысловасьцю, а таксама там, дзе востра адчуваецца беспрацоўе.

Фінальны дзень...

(На ўсебеларускіх спаборніцтвах па цяжкай атлётыцы)

26-га... Фінальны дзень...

Мускулы напруджваюцца да крайнасьці. Барацьба ідзе вельмі асьцярожна. Працаўнікі аднолькава хітрыя і спрытныя.

У хмурым будынку з квадратнымі масыўнымі шэра-зялёнамі калёнамі—цішыня.

Усе вочы накіроўваюцца на сярэдку залі. Там на падлозе—тоўсты абшэрны квадрат — матрац. На ім быццам літыя з бронзы, амаль голыя фігуры. Пацеюць. Цісьнуць адзін другога моцным абняцьцем.

— Ах...х...х...

Вырываецца з грудзей уздох.

Атлет ухітрыўся ўзяць свайго ворага на тур дэ бра ў партэру. Той упаў на лапаткі. Сьвісток...

— Перамога залічваецца за...

* * *

Пераможцамі па францускай барацьбе аказаліся 6 чалавек.

Гэта: у вязе пара — Плотнікаў (Менск); т лягчэйшай — Каралькевіч (Менск); у легкай—Мікеніцкі (Менск); у сярэдняй—Руткоўскі (Орша) і Антонап (Бабруйск); у паўцяжкай—Саўт (Бабруйск).

Па падняцьцю цяжкасьцяў — на першыя месцы: у вазе пяра—Бусловіч (Барысаў); у лягчэйшай — Савіч (Орша); у легкай—Равічбах (Барысаў); сярэдняй—Андрэяў (Магілеў); у паўцяжкай—Кузьмін (Менск).

На ўсесаюзныя спаборніцтвы, якія адбудуцца ў сярэдзіне лютага ад БССР паедуць: Савіч, Кірэяў, Плотнікаў, Каралькевіч і Сініцкі.

Ю. К.

Запытаньні і адказы

Запытаньне № 793 (Чэрамісіна). Ці прымуць комсамольца актывістага ў кандыдаты КП(б), калі ён ўпаўне падрыхтаваны, мае адпаведныя рэкомэндацыі, але ў сучасны момант зьяўляецца беспрацоўным?

Адказ. Могуць прыняць.

Запытаньне № 794. (С. Патапэнка). Дзе можна дастаць кніжку „Палітграмата вясковага комсамольца?

Адказ. Ва ўсіх кнігарнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

Запытаньне № 795 (Х. З) Ці можа райком ЛКСМБ даць вымову комсамольцу, калі пытаньне аб ім яшчэ не стаяла ў ячэйцы?

Адказ. Перш чым вынесьці вымову, райком павінен быў паведаміць аб такім комсамольцы. ячэйку.

Запытаньне № 796 (Гарбачова). Куды можна паслаць напісаную мною п'есу і ці атрымаю я за яе гонарар?

Адказ. Можаш накіраваць сваю п'есу у рэдакцыю любой часопісі. Калі п'еса падыдзе да друку, атрымаеш гонорар.

Запытаньне № 797 (Цямінскага). Ці мае права ячэйка ЛКСМБ трымаць комсамольца доўгі час (2 гады) на аднэй працы, напрыклад, у рэдакцыі насьценгазэты?

Адказ. Мае права.

Запытаньне № 798 (Ц) Ці можа беспартыйны прысутнічаць на зачыненым пасяджэньні бюро ячэйкі?

Адказ. Ня можа.

Запытаньне 799 (Тайбкіна). Ці можна піонэра-комсамольца вызначыць памочнікам павадыра атраду?

Адказ. Калі бюро ячэйкі знойдзе магчымым, можна.

Запытаньне № 780 (А. Лукомскага). Як можна паступіць комсамольцу на рабфак?

Адказ. Умовы прыёму на рабфак у 27 28 годзе яшчэ не апублікаваны.

У тры радкі.

▣ Вечар сучаснай Беларускай культуры організуецца Інбелкультам у Маскве ў лютым м-цы.

▣ Перавучот маладнякоўцаў па БССР праводзіцца ў працягу бягучых 2-х тыдняў. Перавучот вядзе ЦБ „Маладняка".

▣ Продаж паштовых марак будзе організаван ва ўсіх сельсаветах БССР, дзе няма паштовых установ. Адначасна вывешваюцца там паштовыя скрынкі.

▣ Усебеларускія спаборніцтвы па лыжах і каньках распачынаюцца ў Менску 13-га лютага.

Усім членам і кандыдатам Менскага АК ЛКСМБ.

Апошні пленум АК адбудзецца 4-го лютага у 6 гадз увечары.

У парадку дню пытаньні зьвязаныя з акруговай конфэрэнцыяй ЛКСМБ.

Шырэй дорогу--гармонь ідзе!

* * *

4 лютага г. г. адчыняецца Аршанскі акруговы зьезд-конкурс гарманістых.

Перад гэтым адбудуцца раённыя конкурсы, якія сбяруць на акруговы конкурс па двое дэлегатаў:

Лепшым гарманістам акруговы конкурс прысудзіць прэміі.

Акрамя гульні на гармоніках і раздачы прэміі ў парадак дню конкурсу ўваходзяць таксама даклады з месц і даклад аб культурна-масавай працы.

* * *

Сьвіслацкі райком ЛКСМБ (Бабр. акр.) вядзе падрыхтоўчую працу да скліканьня раённага зьезду гарманістых.

Зьезд працягнецца 2 дні (28 і 29 студзеня). Дэлегатаў на ім будзе 30—35 чал.

НАВІНЫ НАВУКІ І ТЭХНІКІ.

Няма больш асколкаў.

У горадзе часта бываюць сутычкі аўтамабіляў. Найбольшую небясьпеку для жыцьця шофэра ў такім выпадку прадстаўляе пярэдняе аўтамабільнае шкло.

У Нямеччыне ў сувязі з гэтым вынайдзен зараз новы від аўтамабільнага шкла, так званага „жалезашкла", якое не дае асколкаў пры самых моцных ударах.



У гэтае шкло ўплаўлена на адлегласьці 5 сантымэтраў адзін ад другога паземныя стальныя пруцікі. З такім узмацнёным шклом рабіліся наступныя вопыты. На пярэдняе шкло аўтамабіля з адлегласьці ў 10 мэтраў запушчалася 7-ці пудовая сьвінцовыя куля. Сіла, з якой падобная „куля" падала на шкло раўнялася сіле ўдару двух аўтамабіляў, якія мчаліся насустрэч адзін другому з хуткасьцю 80 кілёмэтраў у гадзіну.

Што-ж было? Фотографія паказвае толькі легкую павуціну расколіны на шкле.

Запамінаючая машына.

Прывабная ідэя! Пабудаваць такі апарат, які механічна запамінаў-бы справы і даручэньні свайго гаспадара, і ў патрэбную хвіліну напамінаў-бы аб гэтых справах. Апарат, які зьнішчыў-бы запісныя кніжкі, спазьненьні, адцяжкі спраў, зацяжкі пасяджэньняў і раскіданасьць. Апарат, які ўнёс-бы пераварот у працу нашых актывістаў, грамадзкіх працаўнікоў і г. д., разгрузіўшы сморaную, задзерганую памяць.

Такі апарат ужо вынайдзен і будуецца цяпер у Францыі фабрычным спосабам.

Уявіце сабе невялікую і зграбную дошчэчку „перакіднага каляндэру" з 365 дзейнымі лісткамі, якія разьдзелены на 48 граф: 24 графы на левай прадоўжнай палове лістку і 24 на правай, Кожнай графе адведзен вызначана чвэртка гадзінны праможак ў 12-ці гадзінным рабочым дню. Левая частка—адведзена першай палове дню (скажам—ад 9 гадзін раніцы да 3-х гадзін дню), правая-ж — другой палове дню: з 3-х гадзін да 9-ці гадзін увечары.

Па прадоўжных краёх дошкі разьмяркаваны, далей, ца шэрагу „запамінаючых уключыцеляў", падобных на ружэйныя куркі, якія паварочваюцца на занавесках.

Каб прымусіць машыну запомніць справу: пасяджэньне, даклад, лекцыю, вызначэныя, скажам на 9 гадзін раніцы, 2 гадзіны дню і 5 гадзін вечару—вы запісваеце некалькі слоў у адпаведных графах вызначанага днеўнога ліста і вечарам, на пярэдадні дзелавога дню, узводзіце адпаведныя куркі „9", „2" і „5".

Роўна ў 9 гадзін раніцы, у 2 гадзіны дню і 5 гадзін вечары «машына запамінаньня» успомніць вам аб сабе рэзкімі і атрывістымі званкамі.

У адзін час са званкамі выскакваюць і чырвоныя сыгнальныя кнопкі: на той выпадак, калі ў вас, у часе званка, выпадкова ня было побач з машынай.

Сакрэт „мэханічнага запамінаньня"—вельмі ўдобны і просты. Зьнімеце крышку з дошкі. Вы ўбачыце бязьмежную стальную і пруткую стужку, якая рухаецца (ад мэханізму гадзіньніку) паміж двума вялікамі з хуткасьцю аднаго абароту ў 24 гадзіны. Сустракаючы на сваім шляху ўвутраны выступ, створаны ўзьведзеньнем курка, — яна выгінаецца і спружына прыводзіць у рух малаточак званка. Потым паўзе далей да наступнага выступу і г. д. і г. д.

Папраука

У № 11 ад 26 студзеня была зроблена памылка. Было надрукавана, што ўсебеларускія піонэркурсы будуць скліканы ў лютым месяцы, у той час, калі гэтыя курсы павінны быць скліканы вясною.

Аб чым сумуюць пальцы сьляпых.

(У Беларускай Дзяржаўнай Школе Сьляпых).

Я стаю ў клюбе школы сьляпых і дзіўлюся разьвешаным па сьценах рэльефным картам зямлі і мора. Яны напамінаюць сківаіцу дзеда сьцягнутую ў вузлы і зьвязючую правеламі.

Я пільным поглядам убіраю ў памяць лінію Карпацкіх гор, якая расьцягнулася на карце карычневым, сумрачным жгутам.

Зачыняю вочы і пальцамі прабую нашчупаць на зямной паверхні Карпаты. І я нашчупваю... Пірынеі.

А за сьцяной з пад чыіхсьці ўрачыстых пальцаў павольна і ціха льлецца скрыпічная незнаёмая песьня. Праз вакно відна санная горка, шкляна-ружовая на заходзячым сонцы, і па ёй з вясёлымі крыкамі зьяжджаюць на санках бязутрымныя дзеці. Недалёчка—другая група дзяцей. Хлопчыкі лоўка коўзаюцца на каньках, бліскучых, як першы рачны лёд.

Хто скажа, што гэтыя дзеці— сьляпыя; дзеці, пазбаўленыя самай вялікай чалавечай радасьці—глядзець. У многіх з іх ёсьць вочы, такія-ж, як і ва ўсіх дзяцей—чорныя, шэрыя, блакітныя—вочы, абкружаныя прыгожым аксамітам расьніц, вялікія і вільготныя. А вось няма ў іх жыцьця і блізка яны здаюцца прахураныя танчэйшым вечным туманам, які схаваў ад іх сьвет.

Бацькі пасылаюць сваіх сьляпых дзяцей у школу вучыцца жыць без вачэй. Гэта вялікая навука. Крыніца яе ў пальцах, нэрвовых і чуткіх. Пачынаюць, скажам, з кубачка, звычайнага кубачка, з якога п'юць гарбату. Сьляпое дзіця доўга лашчыць яго задумчывымі сваімі пальцамі, водзіць імі па сьценках кубачка, па дну, пагружае іх у ўнутраную пустату кубачка, а потым з гліны, з халаднаватай сырой гліны тыя ж пальцы ствараюць копію кубачка, дзіўна падобную.

... Вось Маруська. Сьлепанароджаная без вачэй дзяўчынка. Восем год таму назад, у цёмную жудусную ноч, яе, 10 штодзённае дзіцё, падкінулі чужым людзям. Да апошняга часу яна жыла ў прытулку. Сьляпая сярод сотні дзяцей, якія бачылі! І да 8 мі гадоў яна ня ведала свайго твару. Цяпер яе вучаць: гэта Маруся, нос, гэта—рот.

А гэта што?—цярэбіць настаўніца яе маленькае зморшчанае вуха.

Гэта вушка,—ужо ведае як адказаць Маруся.

Любяць сьляпыя дзеці абстукваць розныя рэчы, прытульваючыся да іх вухам. Вось хлопчык абстуквае дзеравяную шафу, памалу ходзіць наваколо яе, і сьляпыя яго зрачкі, паднятыя ўверх, пад самыя бровы, здаюцца залітымі асалодаю якіхсьці далёкіх мар, поўных гукаў. Абстукаўшы дзьверцы шафы, хлопчык адходзіць ад яе і гучным голасам заве таварыша:

— Васінь ка-а!..

Васінька хутка зьявіўся на кліч таварыша і вось два сьляпцы нечакана ўступаюць у барацьбу „на лапаткі". Палажыў Васілёк—і абодвы сьмяюцца, задыхаючыся ад барацьбы...

Кім будзе гэты вясёлы „чэмпіён" Васілёк, калі вырасьце? Ён гаворыць, што калі небудзь будзе вучыць дзяцей, якія бачаць, як вучыць іх дзядзька Ваўчок. Сьляпы таварыш Ваўчок кончыў Беларускі Дзярж. Унівэрсытэт і цяпер выкладае ў вячэрнім рабфаку гістарычны матэрыялізм. Яго вялікія веды пранікі ў яго голаву ў выглядзе цэлага рою гукавых сачатаньняў, не даючы ні малейшага ўяўленьня аб конкрэтным надворным выглядзе. Але вось сядзіць ён побач са мною каля печкі, з такой спакойнай ухмылкаю, і тлумачыць, як дзецям выкладаць гэомэтрыю, адну з самых цяжкіх навук. Падводзіць мяне да сьцяны, на якой разьвешаны кругі, трыкутнікі, трапэцыі. Яны зроблены рукамі сьляпых з гнуткіх галінак вярбы.

— Вось зразумейце,—прапануе мне тав. Ваўчок.

Потым тав Ваўчок вымае з свайго портфэлю „сьляпы" пісьмовы прыбор Гэта геніяльнае вынаходжаньне. Рашотка з мноствам квадратовых клетачак. Зьнізу да яе прымацоўваецца ліст жоўтай абвёртачнай паперы. І тупым шыльцам бачучыя рукі сьляпога выціскаюць на паперы ў межах кожнай клетачкі ад аднаго да 6 пунктаў, Лік і разьмяшчэньня пунктаў у клетцы вызначаюць літэру. Зьняўшы потым паперу з пласьцінкі і перавярнуўшы яе другім бокам, сьляпы водзіць пальцамі па пунктавых бугарках і чытае.

... У школьнай бібліотэцы ў маленькага століка бібліотэкара—чарга.

— Дайце мне Гогаля „Мёртвые души".

— Мне „Новь" Тургенева!

А Іоха, поўная, нізкарослая дзяўчынка, з чырвонымі вуснамі і трошкі гаварлівая, сакрушаецца:

— Гавораць „Война и мир", „Война и мир", а чаму для сьляпых не надрукуюць? А чаму яшчэ савецкіх пісьменнікаў ня выпусьцілі?

І нездаволеная, Іоха просіць даць ёй таксама з „тургэнеўскіх".

Іёхе хутка 18 год. Сотні пэрыодаў часу, якія завуцца ў бачучых днямі, яна працавала седзячы каля кляснага стала за кнігамі і потым у майстэрні за пляценьнем кошыкаў ці матарачых дарожак. Яна навучылася жыць без вачэй. І ходзіць яна па школьнаму памяшканьню ўпэўненаю хуткаю паходкаю, чуць пакачываючыся. Праходзячы каля малодшых, яна абавязкова працягне руку да якога небудзь сарамлівага дзіцячага падбародку і сваімі цёплымі мягкімі пальцамі сагрэе яго.

Іёха-комсамолка. На сходах яна першая опонэнтка і араторша. Яна начытаная і прамова яе поўна нечаканымі словамі і зваротамі.

У школе 35 дзяцей—хлопчыкаў і дзяўчат. Яны вельмі дружаць са старэйшамі выхаванцамі, заражаючыся іх воляю ў барацьбе са сваею сьлепатою. Дзеці здольныя. Яны востра ўважлівы на занятках у клясах і лоўкія ў майстэрні.

Але блізіцца рэволюцыя ў „сьляпых рамеслах". Пальцы сьляпых сумуюць па стальных плыскасьцях, шумна жывых і гарачы. Новы лёзунг выкінуты сьляпым!:

— Замест традыцыйнага пляцэньня кошыкаў — дайош заводзкі варштат!

М. Лінскі.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Да увагі комсамольцаў шахматыстых.

Пры клюбе імя Кіму організуецца цэнтральны комсамольскі шахматна-шашачны гурток.

Запіс жадаючых адбываецца ў праўленьні клюбу.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. В. КУРЦІК

Галоўлітбел № 23710 2-ая Дзяржпрукарня БДВ.